ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 4 (924) | АЎТОРАК, 11 сакавіка 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. Першым на яго парадку дня абмеркавана пытанне аб вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і выхаваўчай рабоце кафедры беларускай культуры. З дакладам выступіў яе загадчык дацэнт Д.Д.Паўлавец.

Старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава праінфармавала аб стане медыцынскага абслугоўвання студэнтаў ГДУ.

Заслухана пытанне аб размеркаванні сродкаў, якія выдзяляюцца з бюджэта Рэспублікі Беларусь на фінансаванне фундаментальных даследаванняў у 1997 годзе. З інфармацыяй выступіў начальнік НДС В.Р.Сафонаў.

З паведамленнем аб рэарганізацыі інфармацыйна-вылічальнага цэнтра выступіў першы прарэктар прафесар М.В.Селькін.

Савет зацвердзіў імянных стыпендыятаў.

Па конкурсу на вакантную пасаду загадчыка кафедры ЭІ і АСК абраны дацэнт С.М.Гавейка.

Савет рэкамендаваў БелВАКу на прысваенне вучонага звання дацэнт Шаршнёву Яўгену Барысавічу з кафедры оптыкі.

На Савеце разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

*З УЗНАГАРОДАЙ!*

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту ТРАФІМОВІЧ Іван Рыгоравіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

## Аб'яўляецца конкурс «МАЛАДЫЯ -- МАЛАДЫМ»

Пад такой назвай Рэспубліканскім цэнтрам здароўя, Міністэрствам аховы здароўя Беларусі аб'яўлены конкурс. Яго мэтай з'яўляецца выяўленне найбольш эфектыўных і пераканаўчых, з пункту гледжання маладых людзей, форм медыцынскай асветы і нагляднай агітацыі ў галіне прафілактыкі залежнасці (наркаманія, алкагалізм, курэнне).

Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты ВНУ, студэнцкія калектывы і аб'яднанні.

Спонсар конкурсу: jelliner -- цэнтр па прафілактыцы і лячэнню залежнасцей (Нідэрланды).

Прызавы фонд конкурсу: 1-ае месца -- пішучы відэаплэер, 2-ое і 3-яе -- фотаапараты.

Для пераможцаў у кожнай намінацыі прадугледжаны заахвочвальныя прызы.

Па пытаннях конкурсу звяртацца ў аддзел выхаваўчай работы ГДУ, гал. корпус, п. 1-16.

## УДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў КАНГРЭСЕ БУДУЧЫХ ЮРЫСТАЎ

На працягу 2 дзён у Мінску праходзіў першы кангрэс беларускай асацыяцыі студэнтаў права, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі паўтара дзесятка навучальных устаноў краіны. Наш універсітэт прадстаўлялі на ім дэкан гісторыка-юрыдычнага факультэта дацэнт М.І.Старавойтаў, студэнты спецыяльнасці "Правазнаўства" першакурснік Юрый Жораў, старшакурснікі Пётр Нікіценка, Вячаслаў Смірноў, Святлана Волкава.

На кангрэсе адобрана рашэнне аб уступленні асацыяцыі ў Саюз юрыстаў, унесены змяненні ў статут.

Прэзідэнтам зноў выбрана гапраўлення асацыяцыі стаў студэнт юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Сяргей Хухлындзін.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

За выдатную вучобу, актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце і грамадскім жыцці Саветам універсітэта па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі назначаны імянныя стыпендыі на II семестр 1996-97 навучальнага года:

*з 1 студзеня*

**ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**КУРАШОВАЙ Таццяне** -- студэнтцы 5 курса эканамічнага факультэта.

*з 1 лютага*

**ІМЯ Я.КУПАЛЫ**

**КСЯНДЗОВАЙ Алене** -- студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта;

**ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**ШПЫРКО Вользе** -- студэнтцы 4 курса матэматычнага факультэта;

**ІМЯ Я.КОЛАСА**

**ВАЙЦІШКІНУ Віктару** -- студэнту 4 курса факультэта фізічнай культуры;

*з 1 сакавіка*

**ІМЯ П.БРОЎКІ**

**ШПАКУ Вячаславу** -- студэнту 3 курса гісторыка-юрыдычнага факультэта (спецыяльнасць "Правазнаўства");

**ІМЯ К.КРАПІВЫ**

**СІРОТКІНУ Андрэю** -- студэнту 5 курса гісторыка-юрыдычнага факультэта (спецыяльнасць "Гісторыя");

**ІМЯ Я.КАРСКАГА**

**ВОЛКАВАЙ Святлане** -- студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта;

**ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**НІКІЦЮКУ Юрыю** -- студэнту 4 курса фізічнага факультэта.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты факультэта фізічнай культуры горача віншуюць выкладчыцу кафедры АЛФК КАВАЛЁВУ Вольгу Аўрамаўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.*

* * *

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры рускай літаратуры КАПШАЙ Наталлю Паўлаўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.*

* * *

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, кафедра оптыкі, аддзел выхаваўчай работы горача віншуюць вядучага лабаранта названай кафедры АЛЯШКЕВІЧА Мікалая Аляксандравіча з нагоды паспяховай абароны ім дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

*НАШИ ЮБИЛЯРЫ*

# ГУМАНИСТ-ПОДВИЖНИК

По одной из классификаций социальных типов личности выделяются: деятели (для них главное -- активное практическое делание); мыслители (для них главное -- смотреть и размышлять); люди чувств и эмоций; гуманисты-подвижники. Последние отличаются обостренным чувством ощущения душевного состояния других людей, любят ближнего как самого себя (по евангельской заповеди), спешат делать добро. Конечно, грани между этими типами личности подвижны и относительны, они переплетаются между собой. И все же можно говорить о преимущественном воплощении в том или ином конкретном человеке определенного типа личности. Тамара Петровна Гаранина -- яркий пример гуманиста-подвижника.

Уже почти четверть века она плодотворно трудится в Гомельском университете имени Ф.Скорины. Кандидат философских наук, доцент Т.П.Гаранина стала ведущим этиком вуза, опубликовала большое число статей, брошюр, методических работ по



различным проблемам этики и нравственного воспитания. Она является соавтором книг "Патриотическое воспитание трудящихся" (Минск, 1986), "Любовь, брак, семья" (Минск, 1987), "Гомельская область" (Минск, 1988).

12 лет на общественных началах Т.П.Гаранина была ректором народного университета нравственно-эстетического воспитания ГГУ. Многие тысячи молодых людей получили в нем заряд духовного развития. На базе этого университета ею создана специализация "Организация и методика внеклассной и внешкольной работы по подготовке заместителей директоров школ по воспитательной работе, руководителей кружков декоративно-прикладного творчества".

В своей деятельности Тамара Петровна не замыкается в рамках вуза. Она стала одним из популярных лекторов по этической тематике, нравственным проблемам семьи, выступила во всех районах Гомельской области, по областному телевидению. Своим опытом работы она делилась на областных и республиканских конференциях и совещаниях, достойно представляла Белоруссию на научных и методических форумах в Москве, Ленинграде, Вильнюсе, Таллине, Киеве, Тамбове и других городах бывшего Союза ССР.

Все, кто слушал лекции Тамары Петровны (студенты, пропагандисты, члены трудовых коллективов), говорят о необыкновенно сильном впечатлении от них. Это не просто набор фактов и теоретических положений, а лекция-диалог, заинтересованный, эмоционально окрашенный, яркий разговор о том, что волнует лектора и аудиторию. Т.П.Гаранина стремится к тому, чтобы слушатель не просто усвоил сумму этических знаний, а чтобы он стал лучше, чище, добрее, чтобы он задумывался над нравственными проблемами, о которых порой забываешь в горячке повседневности.

Особо следует рассказать о деятельности Т.П.Гараниной в наши трудные годы. Это помощь детям -- сиротам, инвалидам, из многодетных и малообеспеченных семей. Организуя эту работу под эгидой областного отделения Белорусского Детского фонда, Тамара Петровна развивает у студентов-участников благотворительных акций деятельную доброту, а не просто сочувствие. За эту подвижническую работу Т.П.Гаранина была награждена Почетной грамотой Кабинета Министров Республики Беларусь. В целом многогранная деятельность юбиляра была отмечена государственными наградами: медалями "За трудовую доблесть", "Ветеран труда", серебряной медалью ВДНХ СССР, почетными знаками и званиями, грамотами.

Широко известна общественная работа Т.П.Гараниной. Многие годы она возглавляла городскую организацию общества книголюбов, консультационный пункт при Доме гражданских обрядов, научно-методический совет по этике при областной организации общества "Знание". Она и сейчас является членом президиума областного отделения фонда культуры, председателем совета "Семья", членом правления областной организации Белорусского Детского фонда.

Все в университете знают, что Тамара Петровна отзывчива к чужой беде, в то же время она умеет искренне радоваться успехам своих коллег, друзей и просто знакомых.

*Поздравляя Тамару Петровну Гаранину с 60-летним юбилеем, желаем ей доброго здоровья, сохранения замечательных личных качеств ЧЕЛОВЕКА, борца, воспитателя, наставника молодежи. Надеемся, что еще долго не погаснет огонь, возжигающий факел света и добра в ее руках и сердце.*

**В.КАЛМЫКОВ,**
**заведующий кафедрой философии, доктор философских наук, профессор.**

# ТРАДЫЦЫЯ АДРАДЖАЕЦЦА





У пачатку 70-х гадоў кафедра алгебры і геаметрыі правяла першую сустрэчу са студэнтамі, якія жылі ў інтэрнаце матэматычнага факультэта. Гэта сустрэча паслужыла пачаткам адной з лепшых універсітэцкіх традыцый -- больш цесным зносінам паміж студэнтамі і выкладчыкамі. Практычна ўсе кафедры універсітэта ў тыя ж гады пераналі наш прыклад. Але вось распаўся вялікі Саюз, а разам з гэтай падзеяй адышлі ў мінулае і шматлікія, у тым ліку -- добрыя традыцыі.

...І вось 26 лютага наша кафедра практычна ў поўным складзе, на чале з рэктарам прафесарам Л.А.Шамятковым была ў гасцях у студэнтаў інтэрната па вуліцы Кірава. Мы размясціліся за столікамі ў даcтаткова ўтульным кафэ на першым паверсе. Зразумела, пачатак размовы належаў рэктару, і Леанід Аляксандравіч адразу выклікаў прыхільнасць нашых гаспадароў не толькі да сябе, але і да ўсіх нас. Пасля размовы аб сённяшніх буднях і праблемах універсітэта "пасыпалася" серыя пытанняў. Адказы на іх пераклікаліся з успамінамі членаў кафедры пра свае студэнцкія гады, пра цярністы шлях у навуку. З цікавасцю ўспрымаліся расказы загадчыка кафедры алгебры і геаметрыі прафесара А.М.Скібы, прафесара С.Ф.Каморнікава, дацэнта А.Ф.Васільева.

Нечакана на адзін са сталоў "легла" гітара. Чакаць прыйшлося нядоўга. Выкладчыкі кафедры В.В.Аніськоў, В.Р.Сафонаў адкрылі імправізаваны канцэрт. А затым у адказ гучалі песні, якія выконвалі студэнты. Іх песні, магчыма, бліжэй да дня сённяшняга, але апладысменты размеркаваліся пароўну.

Не ведаю, як астатнія мае калегі, а я быў шчыра рады гэтай сустрэчы. Як мне здаецца, і студэнтам яна была па душы... Ды і хто будзе адмаўляць, што памяць сэрца -- самая моцная. Дык будзем спадзявацца, што добрая традыцыя зноў увайшла ў нашае універсітэцкае жыццё!

**Л.ПАЛЯКОЎ,**
**дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі.**

**На здымку: перад студэнтамі выступае рэктар прафесар Л.А.Шамяткоў.**

**Фота У.Чысціка.**



# ЗА ВЫЯЎЛЕННЕ ТАЛЕНАВІТЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**На імя рэктара нашага універсітэта Л.А.Шамяткова за подпісам начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення адукацыі М.Я.Кобрынскага дасланы ліст, у якім выказваецца вялікая ўдзячнасць вучоным і выкладчыкам ГДУ за забеспячэнне навуковага падыходу да арганізацыі работы па выяўленню таленавітых школьнікаў у ходзе падрыхтоўкі і правядзення абласных алімпіяд з просьбай заахвоціць**

**СТАРШЫНЬ ЖУРЫ ПА ДЫСЦЫПЛІНАХ:**

**беларуская мова** -- дацэнта кафедры беларускай мовы В.А.ЛЯШЧЫНСКУЮ;

**руская мова** -- загадчыка кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, дацэнта У.І.КОВАЛЯ;

**англійская мова** -- старшага выкладчыка кафедры англійскай мовы Т.Р.СУРМЯНКОВУ;

**нямецкая мова** -- выкладчыцу кафедры нямецкай мовы Р.І.БУРАНКОВУ;

**французская мова** -- выкладчыцу кафедры французскай мовы Н.П.КАЗЯЛЕЦ;

**матэматыка** -- загадчыка кафедры вышэйшай матэматыкі д. ф-м. н. Ю.У.МАЛІНКОЎСКАГА;

**фізіка** -- загадчыка кафедры агульнай фізікі дацэнта І.В.СЕМЧАНКУ;

**інфарматыка** -- загадчыка кафедры ВМ і праграміравання дацэнта М.І.ЖАДАНА;

**біялогія** -- загадчыка кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесара В.В.ВАЛЕТАВА.

**ЧЛЕНАЎ ПРАДМЕТНЫХ ЖУРЫ:**

Л.Ф.Кахоўскую, І.І.Кобыш -- дацэнтаў, Г.А.Даўгяла, А.І.Халяўка -- старшых выкладчыкаў, Н.І.Лапіцкую -- асістэнта (кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства);

В.С.Новак, В.І.Смыкоўскую -- дацэнтаў кафедры беларускай літаратуры;

Т.М.Усольцаву -- старшага выкладчыка кафедры рускай літаратуры;

С.М.Аніськову, А.М.Ермакову, Н.І.Фралову -- асістэнтаў кафедры беларускай мовы;

Л.С.Васільеву -- выкладчыцу кафедры англійскай мовы;

Л.І.Протчанка -- выкладчыцу кафедры французскай мовы;

У.В.Мухіна -- дацэнта, В.М.Бабкову -- асістэнта (кафедра матаналізу);

А.Р.Міроціна, У.М.Семенчука -- дацэнтаў, М.М.Курносенку -- асістэнта (кафедра вышэйшай матэматыкі);

А.В.Лубачкіна, А.Ф.Каморнікава -- дацэнтаў, М.С.Далінскага -- старшага выкладчыка, Т.М.Дзёмаву, Т.Р.Багданаву, Г.В.Фаміну -- асістэнтаў (кафедра ВМ і праграміравання);

А.Р.Краўчанку, Т.А.Шафарэнка -- старшых выкладчыкаў, А.У.Іванова, І.А.Прылуцкага, В.В.Чарнюка -- асістэнтаў (кафедра геаграфіі);

Т.Ю.Гілеп -- старшага выкладчыка, Т.В.Патылкіну -- асістэнта (кафедра фізіялогіі чалавека і жывёлін);

І.Ф.Расашка -- дацэнта, А.Ю.Жук -- асістэнта (кафедра заалогіі і аховы прыроды);

В.Я.Верамейчыка -- дацэнта, С.У.Аўсеенку -- асістэнта (кафедра батанікі і фізіялогіі раслін).

**Хроніка**

## НОВЫ НАЧАЛЬНІК ІВЦ

На мінулым тыдні загадам па універсітэту ад абавязкаў начальніка ІВЦ вызвалены па ўласнаму жаданню А.Б.Дземуськоў. Ён пераведзены на пасаду старшага выкладчыка кафедры матэматычных праблем кіравання.

Начальнікам ІВЦ назначаны кандыдат тэхнічных навук М.С.Далінскі, які працаваў раней старшым выкладчыкам названай кафедры.

## ВЫВЕДЗЕНА СА СТРУКТУРЫ ФАКУЛЬТЭТА

Да справаздачна-выбарчага прафсаюзнага сходу, які адбыўся 28 лютага г.г. на факультэце фізічнай культуры, тут амаль ніхто не ведаў, у якім падпарадкаванні знаходзіцца кафедра фізічнага выхавання. Гэта выклікала пэўныя непаразуменні і спрэчкі. Таму даводзім да ведама: загадам па універсітэту ад 4 лістапада 1996 г. кафедра фізічнага выхавання пераіменавана ў кафедру фізічнага выхавання і спорту і ёй нададзены статус агульнауніверсітэцкай.

## СТУДЭНТАМ КЛЕРМОН-ФЕРАНА І ГОМЕЛЯ -- АДНОЛЬКАВЫЯ ДЫПЛОМЫ!

На працягу пяці гадоў падтрымліваюць цесныя сувязі наш універсітэт і прафесіянізаваны інстытут "Інжынерыя менеджмента" універсітэта Овернь-КлермонІ. Асноўным вынікам іх супрацоўніцтва стала стварэнне на базе ГДУ Франка-беларускага інстытута кіравання (ФБІК), які паспяхова праходзіць сваё станаўленне і пакуль што не мае аналагаў не толькі ў Беларусі, але, бадай, ва ўсіх іншых краінах СНД.

У студзені і лютым бягучага года 26 студэнтаў эканамічнага і гісторыка-юрыдычнага факультэтаў, якія адначасова набываюць адукацыю ў ФБІК, і 9 выкладчыкаў ГДУ праходзілі стажыроўку ў Клермон-Феране. Сярод выязджаўшых у Францыю была і дэкан эканамічнага факультэта кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Т.В.Карпей. Мы папрасілі Тамару Васільеўну выказаць свае меркаванні аб важнасці і карыснасці ўзаемаадносін дзвюх ВНУ розных школ адукацыі і падзяліцца ўласнымі ўражаннямі ад сустрэч са сваімі замежнымі калегамі.

-- Перш за ўсё размова пойдзе аб традыцыйных абменах студэнтамі, дзелавых паездках у Францыю нашых вучоных і выкладчыкаў, аб агульным педагагічным праекце, які ўяўляецца даволі рэальным. У належны тэрмін былі ўзгоднены планы і праграмы чытаемых дысцыплін. За аснову вучэбнага плана ФБІК пакладзены вучэбны план эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю". У адпаведнасці з ім першы год навучання адпавядае 2 і 3 курсам эканомфака, другі год -- 3 і 4 курсам і апошні -- пятаму курсу.

Па цэламу цыклу дысцыплін навучанне поўнасцю ажыццяўляецца выкладчыкамі ГДУ. Гэта курсы па эканамічных тэорыях, мікра-і макраэканоміцы, арганізацыі вытворчасці, аб банках і банкаўскіх аперацыях і г.д. Па іншых дысцыплінах выкладанне вядзецца як выкладчыкамі Францыі, так і эканамічнага факультэта. Акрамя таго, студэнты ФБІК вывучаюць еўрапейскае права, еўрапейскаю падатковую сістэму, курс камунікацый і г.д. Выкладаюць гэтыя дысцыпліны дырэктар інстытута "Інжынерыя менеджмента", садырэктар ФБІК прафесар М.Шэневуа, яго намеснік М.Дзюбост, вопытнейшыя спецыялісты М.Ус, М.Петаві, М.Рашэт, М.Фаржэкс, іншыя іх калегі. Такая сістэма падрыхтоўкі дазваляе вывучыць асаблівасці эканомікі і кіравання еўрапейскіх дзяржаў і супаставіць сістэмы, прынятыя ў Рэспубліцы Беларусь.

Адна камандзіроўка французскіх выкладчыкаў у Гомель разлічана на 15 гадзін заняткаў са студэнтамі. Гэта адпавядае 20 гадзінам разліковага часу беларускага метаду выкладання. Сістэма, што склалася пры падрыхтоўцы спецыялістаў, дазволіла вызначыць парадак атэстацыі студэнтаў па дысцыплінах. Па тых, у выкладанні якіх удзельнічаюць французскія спецыялісты, удзельная вага адзнакі, выстаўленай імі, складае 75%, а нашымі -- 25%, і наадварот. Максімальны бал у французскай сістэмы -- 20, у нашай --5. Аднак гэта не азначае, што наша 5 заўсёды адпавядае 20 балам французскім.

Сёлета нашы студэнты трэцяга года навучання завяршаюць вучобу па праграме інстытута кіравання вытворчасцю - 1 (15 чалавек) і павінны атрымаць раўназначныя дыпломы як і французскія выпускнікі. Але для гэтага патрэбна атрымаць неабходную колькасць балаў па чатырох так званых вучэбных палюсах: агульная падрыхтоўка; асновы менеджменту; базавы цыкл; стажыроўка.

Працэс навучання арганізаваны такім чынам, што заняткі праводзяцца французскімі выкладчыкамі ў Гомелі на працягу 12-15 тыдняў і ў г.Клермон-Феран у час паездак студэнтаў ФБІК.

Лекцыі і практычныя заняткі вядуцца толькі на французскай мове. Сёлета студэнты 2-га і 3-га гадоў навучання слухалі лекцыі, выконвалі лабараторныя работы і кантрольныя заданні. Неабходна адзначыць, што адзнака студэнтам па выніках кантрольных мерапрыемстваў з'яўляецца асноўнай. Пры гэтым ацэньваецца не толькі правільнасць адказу, але і методыка ізлажэння пытання, пісьменнасць. Вось чаму 20 балаў могуць набраць толькі асобныя студэнты. Найвышэйшы ўзровень ведаў сярод студэнтаў ФБІК па ацэнцы французскіх выкладчыкаў маюць Аляксандр Вамбрыкаў, Галіна Кожанава, Святлана Пархамовіч. Названыя і некаторыя іншыя студэнты на эканамічнам факультэце ГДУ таксама паказваюць глыбокія грунтоўныя веды.

Чарговая паездка нашых студэнтаў у г.Клермон-Феран была вельмі пазнавальнай у культурным плане. Увесь час яны жылі пасобна ў сем"ях французскіх студэнтаў інстытута кіравання, што дазволіла больш даведацца пра іх быт, інтарэсы, пра тое, як яны рыхтуюцца да вучэбных заняткаў. Студэнты былі ў Парыжы, наведалі Луўр, азнаёміліся са многімі славутасцямі аднаго з прыгажэйшых гарадоў Еўропы.

У наступным месяцы мы чакаем у Гомелі сваіх французскіх сяброў. Яны прыедуць у горад над Сожам, каб пазнаёміцца са студэнцкім жыццём у ГДУ.



## НАТХНЕННЯ І ФАНТАЗІІ ЎЗЛЁТ

Самыя шчырыя словы ўдзячнасці, падзякі за цеплыню, пяшчоту чуюць жанчыны-маці, каханыя, бабулі ў святочны дзень 8 Сакавіка. З поўным правам яны заслугоўваюць паважлівых адносін да сябе, бо заўсёды, у любых жыццёвых абставінах саграваюць душы сваіх дзяцей, родных і блізкіх сардэчнасцю і ласкай. Свае светлыя пачуцці да любых матуль дочкі і сыны імкнуцца выказаць з дапамогай падарункаў, якія ўручаюць ў святочны сакавіцкі дзень. А матулям найдаражэйшымі ўяўляюцца менавіта тыя, што зроблены рукамі іх дзяцей. А ім многае падуладна: і сурвэтку звязаць ці вышыць, і прыгожы малюнак зрабіць, і арыгінальны выраб з дрэва сфантазіраваць.

Напярэдадні жаночага свята па добрай традыцыі трэцякурснікі універсітэта, будучыя педагогі, якія праходзяць спецыялізацыю "Арганізацыя і методыка пазакласнай і пазашкольнай работы" на чале з Н.І.Колтышавай і Н.Э.Васільчанка /кіраўнікі названай спецыялізацыі/ правялі выстаўку твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Нашы сэрцы і падарункі -- матулям". Самыя разнастайныя вырабы, прадстаўленыя на ёй, вабілі сваёй фантазіяй, прыгажосцю, добрым густам. Былі тут прыгожыя работы з дрэва, вязаныя рэчы, якія здзіўлялі сваёй філіграннай тэхнікай, усемагчымыя пано, малюнкі і інш.

Было відавочна, з якім вялікім натхненнем выконваліся работы У.Собчанкі /гр. Б-31/, які прадставіў тут кухонны набор з дрэва і сурвэткі, Т.Даўжанок /гр. М-32/ – пано ў стылі макрамэ, Н.Агеенка /гр. Б-31/ – вязаныя рэчы, А.Кавалёвай /гр. М-32/ -- пано "Кветкі", Н.Лысенка /гр. Б-31/ -- пано "Ружы", К.Крахмалава /гр. Б-31/ -- разная шкатулка. Як сапраўдная майстрыха звязала каўнерчыкі незвычайнай і складанай тэхнікай пляцення "фрывалітэ" студэнтка матфака А.Крычаўцова, прыгожымі атрымаліся малюнкі ў першакурсніцы біяфака І.Сурынай.

Студэнты ГДУ даўно працуюць у цеснай садружнасці з настаўнікамі і вучнямі некаторых школ г.Гомеля. І на гэты раз побач са студэнцкімі работамі былі прадстаўлены вырабы выхаванцаў гурткоў прыкладнога мастацтва "Сонейка" з СШ N16 /кіраўнік С.М.Шульга/, "Чароўная саломка" з СШ N33 /Н.А.Быхаўская/. Арыгінальнымі былі і экспанаты вучняў СШ N44.

Творчыя работы школьнікаў, якія найбольш спадабаліся наведвальнікам выстаўкі, можна было купіць у падарунак да 8 Сакавіка.

Пераможцы выстаўкі былі заахвочаны грашовымі прэміямі. Іх атрымалі К.Крахмалаў, У.Собчанка, Т.Даўжанок (1-е месца), А.Серакова, В.Кавалёва, С.Гатальская (ІІ месца).

**Т.ДУБЯК.**

## МУЗЫКІ ЦУДОЎНАЕ ГУЧАННЕ...



Музыка... Яна нясе ў наш недасканалы свет Гармонію і Прыгажосць. Менавіта яна здольная закрануць і абудзіць нават самага чэрствага чалавека, загаіць душэўныя раны, аблегчыць пакуты і боль. Мабыць, таму, як Божае благаславенне, праходзіць музыка праз усё чалавечае жыццё, не пакідаючы яго ні на хвіліну — ад нараджэння і да самай смерці...

Увесь кароткі свой век чалавек спяшаецца жыць, дасягнуць нечага, набыць пэўныя матэрыяльныя каштоўнасці, часам не зважаючы на тое, што ён губляе штосьці, значна больш важнае, што адрознівае яго ад усяго навакольнага свету. Абцяжараны складанасцямі жыцця, чалавек і не заўважае нават, як губляе Духоўнасць. І толькі дакрануўшыся душой да сапраўднага мастацтва, ён ажывае, адраджаецца зноў...

Вялікую радасць і задавальненне аматарам беларускай харавой музыкі прынесла выступленне Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Дрынеўскага. Яно з поспехам прайшло ў зале Гомельскага каледжа мастацтваў у рамках фестывалю "Пеўчая акадэмія", які ўжо трэці год пачынаецца ў нашым горадзе. З'яўляючыся адным з першых у рэспубліцы, гэты калектыў добра вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Прычым прыезд у наш горад Міхася Дрынеўскага — гэта важная падзея не толькі ў культурным жыцці Гомеля, але і ў лёсе самога вялікага дырыжора, таму што для яго — гэта вяртанне ў горад былых мар і надзей, дзяцінства і юнацтва. Бо менавіта адсюль пачынаўся зорны шлях у высокае мастацтва Міхася Дрынеўскага, выпускніка Гомельскага музвучылішча імя Н.Сакалоўскага. Іменна тут, у Гомелі, упершыню быў адкрыты і заўважаны ягоны незвычайны выдатны талент, менавіта тут калісьці прагучалі першыя творы ў выкананні сапраўднага майстра сучаснай харавой музыкі.

Прадстаўленая ў гэтым годзе праграма «Звонкія галасы Беларусі», нягледзячы на адсутнасць аркестровай групы, з сапраўднай цікавасцю і захапленнем была ўспрынята слухачамі. У выкананні калектыву гучала і высокая царкоўная музыка, і вясёлыя народныя песні ў апрацоўках М.Дрынеўскага і М.Сіраты. Можна таксама было пачуць і фальклорныя творы, запісаныя ў Гомельскім раёне. І кожны з прысутных меў выдатную магчымасць далучыцца да невычэрпнай скарбніцы вуснай народнай творчасці, убачыць яе тэматычнае багацце і разнастайнасць жанраў, адчуць усю напеўнасць, меладычнасць беларускай лірыкі. Але, напэўна, як заўсёды, у кожнай музычнай праграме ці канцэрце ёсць пэўны твор, які кранае душу, пакідае самае моцнае, незабыўнае ўражанне, прымушае замерці і, стаіўшы дыханне, слухаць...

... І тады сціхае гоман, змаўкаюць людскія размовы, і ў нейкую невядомую далячынь адыходзяць усе надзённыя клопаты і праблемы... Здаецца, замірае жыццё. Быццам Час спыняецца, парушаючы свой вечны ход, каб працягнуць гэтае імгненне. Нічога навокал няма, і толькі чыстыя незямныя галасы адгукаюцца рэхам у нябёсах... Гучыць «Літургія Іаана Златавуста»...

**Святлана КАГАН,**
**студэнтка гр.БА-13 філалагічнага факультэта.**

МЕДЫЦЫНА

# БЕЗ УПОВАНИЙ НА "ВОЛШЕБНУЮ" ТАБЛЕТКУ

**Сегодня стало некой данью моде – лечиться не в поликлиниках и больницах, а с помощью экстрасенсов, которых теперь, что называется, пруд пруди... Чего греха таить, многие из них оказываются на поверку самыми настоящими шарлатанами без соответствующих профессиональных знаний и навыков, но успевшие, воспользовавшись людским доверием, сорвать себе солидный денежный куш. А те, кто уповал на их обещанное скорое исцеление от всяческих недугов, так и остались со своим букетом хворей и чувством горького разочарования.**

Настоящие же народные целители, облегчающие людские страдания, громкой славы себе не ищут, она сама к ним приходит, благодаря их умениям и искреннему желанию помочь больному. К таким подлинным врачевателям можно отнести Валентину Леонидовну Козлову -- магистра биомагнитологии и психотроники, члена Международной Ассоциации народных целителей "Технокор-жан", директора лечебного центра "Артемида". В г.Гомеле ее имя, что называется, на слуху, да уже и из самых дальних уголков СНГ приезжают к ней на лечение больные. И меня свел с ней случай, а не профессиональный интерес журналиста.

В.Л.Козлова -- выпускница факультета физического воспитания нашего университета по специальности "Оздоровительная, лечебная и физическая культура", прошедшая специализацию в г.Ялте в НИИ курортологии и климатолечения им. И.М.Сеченова, в Московском институте травматологии и ортопедии им.Н.Н.Приорова. Она создала свой лечебный центр, ведет совместную научную и практическую работу с кафедрой ОЛФК ГГУ, аспиранткой которой является, по разработке и внедрению новых методик оздоровления и реабилитации населения Гомельщины, как наиболее пострадавшей от чернобыльской катастрофы. Эти методики опробировались Валентиной Леонидовной и в университете, и в ее центре. В числе ее пациентов оказалась и я. Нисколько не кривя душой, скажу: мое физическое и духовное состояние заметно улучшилось, хотелось, как говорится, жить и радоваться жизни.

-- Я не люблю слова "нетрадиционные методы" лечения, -- признается В.Л.Козлова. -- Это как раз такие методы, которые тысячелетиями уже используются на практике. Человек создан таким образом, что ему необходима гармония с внешним миром. Если этого нет, наступает дискомфорт, начинаются недомогания. Значит, состояние нашего здоровья напрямую зависит от эмоционального, психофизического состояния. Поэтому должный эффект в процессе лечения больного достигается с помощью применения этих самых "нетрадиционных" приемов: фитотерапии (траволечение), заговоров (лечение словом), воздействия на биологически активные точки и рефлекторные зоны человека и т.д. Важно дать понять людям, что панацеей от болезней не является волшебная таблетка, проглотив которую, они получат скорое и полное выздоровление. Оно может наступить в результате комплексного подхода врача в процессе лечения больного.

Вот уже несколько лет Валентина Леонидовна специализируется на лечении заболеваний опорно-двигательного аппарата и уже завершает работу над кандидатской диссертацией на эту тему. Свыше 100 пациентов, страдающих всевозможными нарушениями в поясничном отделе позвоночника, прошли через ее руки. Они лечились по специально разработанной В.Л.Козловой методике реабилитации, куда входят лечебный массаж и самомассаж, физические упражнения локального действия, биоэнергетическая помощь через слово, число, пламя, жидкость, минерал, программы с использованием духовного потенциала, рекомендации по диете и фитопрофилактике, домашние задания для больных и др. Полученные результаты показали, что все это обеспечивает за короткий срок восстановление работоспособности, является профилактикой обострения заболеваний на длительный период времени, оказывает устойчивый положительный эффект на позвоночник, нормализует состояние нервной и мышечной систем, активизирует тонус организма.

Здесь же впервые разработаны методы активной реабилитации человека на основе индивидуальной оценки уровня его психофизического состояния. Результаты, которые достигнуты, являются уникальной информацией для Республики Беларусь. Лица, подвергающиеся воздействию неблагоприятных факторов -- ионизирующему облучению, эмоциональному перенапряжению и т.д., получают практические рекомендации по предотвращению заболеваний, избавлению от депрессивного состояния.

Есть у Валентины Леонидовны желание работать еще с большей результативностью. Но, увы, пока нет необходимого помещения, которое позволило бы открыть и использовать в лечении тренажерный и спортивный залы, сауну, кабинет массажа и психотерапии, установить компьютерную технику и диагностическое оборудование. Здание такого центра по ул.Кожара пока лишь в стадии строительства. И сроки ввода его в действие в связи с нелегким экономическим положением в республике весьма расплывчаты.

Но люди ждут от нее помощи сейчас и ежедневно. И Валентина Леонидовна умело врачует их души и тела. Очень многим больным, даже тем, кто уже стал терять надежду на выздоровление, В.Л.Козлова вновь вернула радость и ощущение полноты жизни.

Т.ДУБЯК.

Інфармацыя для роздуму

# ЁСЦЬ НАД ЧЫМ ЗАДУМАЦЦА

*(з пасяджэння абласной камісіі па барацьбе з п'янствам і наркаманіяй)*

Статыстыка сбедчыць: за 1996 год па Гомельскай бо-ласці ад ужыбання сурагатнай гарэлкі памерла 400 чалабек, за з'яўленне ў нецбярозым стане ў грамадскіх месцах затрымана 86 тыс.чал., у быцбярэзнік дастаўлена 37.948 чал.

Памятайце! Кожны з іх сапсабаў здароўе і нербы не толькі са е, але і родным, лізкім.

Першае меса ў рэспу ліцы па захборбанню на СНІД займае Гомельская бо ласць -- 1200 чалабек. Кожны дзесяты жыхар г.Сбетлагорска заражаны бірусам СНІДа. Гэта: 70% наркаманаў, 30% -- інфіцырабаных. У 1996 годзе 12 дзяцей нарадзіліся з гэтым захборбаннем.

За г.Сбетлагорскам ідзе Жло інскі раён -- 100 чалабек інфіцырабаных СНІДам. Кожны з іх у заражанай пасля чарно ыльскай абарыі бо ласці з пасла ленай імуннай сістэмай можна пражыць 2-4 гады.

Задумайцеся! Ці хочаце бы папоўніць гэтыя рады?!



ПАЭТЫЧНАЯ ГАСЦЁЎНЯ



**Александр ЯКОВЕНКО,**
**слушатель подготовительных курсов**

## ЖАННА Д"АРК

*Спокойствие и сила сейчас в твоих глазах:*
*Так выглядит красиво лишь ангел в небесах.*
*Господь меч правосудия вложил в твою ладонь*
*И в гущу боя рвется твой беспокойный конь.*
*И ты непобедима, уверенная в том,*
*Что за святое дело ты борешься с врагом.*
*Ты из земли французской изгонишь чужаков*
*И свой народ избавишь от рабства и оков.*
*Родной король "по-царски" тебе за все воздаст*
*И как Иуда, подло, за власть тебя предаст.*
*Несправедливый, скорый тебя осудит суд,*
*И на костре жестоко враги тебя сожгут.*
*Но палачей кровавых все люди проклянут,*
*А о тебе легенды и песни создадут.*

◆◆◆

*Если все тайны откроются сразу,*
*Жизнь превратится в скучную*
*фразу.*
*Но этого, друг, не случится,*
*поверь:*
*Господь охраняет заветную дверь,*
*И нам разрешает лишь иногда*
*Её приоткрыть, но ключи навсегда*
*Нам не отдаст ни за что, никогда.*

◆◆◆

*Волшебство твоих глаз не*
*заменишь*
*Даже самым прекрасным вином,*
*Только встреч опьяненье сменяет*
*Расставаний похмельный синдром.*
*И никто, кроме Бога, не знает,*
*Отчего, как столетья длинны*
*Дни, когда от меня исчезаешь,*
*Оставляя в награду лишь сны.*

◆◆◆

*Я буду ждать тебя всегда:*
*И в этой жизни, и в иной,*
*Пусть даже прах истлевший*
*мой*
*Развеет время по Вселенной*
*Любовь останется живой,*
*Любовь останется нетленной.*

**Станислав СКИРКОВСКИЙ,**
**студент I курса биологического факультета.**

***

*Грусть, сестричка моя*
*дорогая,*
*Посиди со мной у окна,*
*Только ты меня любишь,*
*я знаю,*
*Как и я, ты все время одна.*

*Перекинемся парой словечек,*
*По бокалу вина разольем,*
*Ты затушишь огарочек свечки*
*И опять на всю ночь мы*
*вдвоем...*

*Но как только с востока*
*навстречу*
*Выйдет солнце, лучами слепя,*
*Ты мне тихо прошепчешь:*
*"До встречи"...*
*И оставишь грустить у окна.*

**Михаил ЛИСКОВИЧ,**
**студент Гомельского политехнического института.**

## ТОЧКИ ГОДА



### ВЕСНА

*Весна – лихое время года,*
*Проснулась и кричит природа.*
*Ликует, радуясь беспечно,*
*И поздравляет все, что вечно.*
*И пьет за здравие весны*
*Смолу из вековой сосны.*



### ОСЕНЬ

*Ложатся листья,*
*Желтые, хмельные,*
*То осень счастья*
*Шлет нам позывные.*
*Начало вечности зовет*
*Нас в бесконечный перелет...*



### ЛЕТО

*Зеленый лес, зеленый луг.*
*И все растет, цветет вокруг.*
*О, теплый, светлый летний день,*
*Растопит солнце нашу тень.*
*Не вспоминаем, не грустим!*
*И делаем, все что хотим!*



### ЗИМА

*Лишь землю всю оближет снег,*
*Как время замедляет бег.*
*И хочет все перевернуть,*
*Нас в прошлый вечный год*
*вернуть.*
*А мы не в силах возражать,*
*Мы будем до весны молчать.*

**СПОРТ СПОРТ СПОРТ**

## ПАСПЯХОВЫЯ СТАРТЫ ЛЁГКААТЛЕТАЎ

У лёгкаатлетычным манежы "Дынама" нашага горада прайшлі спаборніцтвы зімовага чэмпіянату па лёгкай атлетыцы, якія ўваходзяць у праграму студэнцкіх гульняў-97. У склад зборнага калектыву нашага універсітэта ўваходзілі толькі выхаванцы факультэта фізічнай культуры. Іх старты аказаліся даволі паспяховымі. У агульным заліку яны занялі другі радок у турнірнай табліцы, уступіўшы першынство толькі студэнтам Акадэміі фізічнай культуры і спорту.

Двайную перамогу святкавала сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Атланце МСМК Наталля Сазановіч. Яна была мацнейшай у скачках у даўжыню і ў бегу на 60 м з бар'ерамі.Вызначылася ў гэтых відах праграмы і МС Юлія Паспелава, на рахунку якой таксама дзве ўзнагароды. Такі ж іх багаж і ў КМС Наталлі Касцючэнка. Яна была мацнейшай у сектары ў скачках трайным і ў скачках у даўжыню.

Майстры спорту Валянціна Баравая і Аляксандр Цітоў заваявалі вышэйшыя ўзнагароды адпаведна ў кіданні кап'я і бегу на дыстанцыі 800 м.

Другім і трэцім прызёрам чэмпіянату стаў кандыдат у майстры спорту Яўген Пудакоў ў спаборніцтвах па штурханню ядра і кіданню дыска. З другім вынікам закончыла сваё выступленне ў штурханні ядра і МС Людміла Старавойтава. МСМК Наталля Гулевіч узнялася на другую прыступку п'едэстала гонару пасля скачкоў у вышыню. Такога ж выніку дасягнуў Мікалай Брэль у кіданні молата. Сярэбраныя ўзнагароды ў бегавых відах праграмы заваявалі таксама МСМК Аляксандр Слюнькоў, кандыдаты ў майстры спорту Леанід Бераснёў, Уладзімір Касцючык, Сяргей Цішкоў.

У дасягнутым поспеху нашых лёгкаатлетаў вялікая заслуга іх трэнераў дацэнтаў Г.І.Нарскіна, Ю.П.Працко, старшага выкладчыка Ф.У.Чарапкоўскага, выкладчыка І.Л.Сівадзед ава.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

У Гомелі ў грамадска-культурным цэнтры працуе выстаўка васковых фігур з музея Санкт-Пецярбурга. Быццам жывыя паўстаюць перад яе шматлікімі наведвальнікамі розныя палітычныя дзеячы, знакамітыя вучоныя, героі Кнігі рэкордаў Гінеса. Аднаго з іх -- самага высокага чалавека планеты вы бачыце на гэтым здымку.

**Фота У.Чысціка.**



## ЗНОЎ ЧЭМПІЁНЫ!

У г.Наваполацку адбыўся чэмпіянат Беларусі па зімоваму шматбор'ю "Здароўе". За ўзнагароды змагаліся зборныя каманды абласцей нашай краіны і яе сталіцы -- Мінска.

На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару не ў першы раз узняліся выкладчыкі кафедры фізічнага выхавання нашага універсітэта майстры спорту Галіна Галаўнёва і Валянцін Ткачоў. Яны ўнеслі важкі ўклад у тое, каб зборны калектыў Гомельшчыны стаў пераможцам чэмпіянату ў агульнакамандным заліку.

## БРАЦЬ НОВЫЯ ВЫШЫНІ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Цэнтр фізічнага выхавання студэнтаў і навучэнцаў падвялі вынікі агляду-конкурсу па спартыўна-масавай рабоце за 1996 год, які прысвячаўся 100-годдзю Алімпійскіх гульняў.

Сярод трэнераў-выкладчыкаў ВНУ Беларусі пераможцам прызнаны дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту нашага універсітэта Ю.П.Працко.

Па спорту вышэйшых дасягненняў лепшай аказалася Акадэмія фізічнага выхавання і спорту, другое месца прысуджана ГДУ, трэцяе -- БДУ. Нагадаем, што ў мінулым годзе студэнтамі Гомельскага дзяржуніверсітэта толькі на рэспубліканскай спартакіядзе ВНУ заваявана 25 залатых, 16 сярэбраных і 14 бронзавых узнагарод.

У аглядзе-конкурсе па спартыўна-масавай рабоце сярод факультэтаў фізічнай культуры зноў, як і ў 1995-ым годзе, перамог факультэт фізічнай культуры ГДУ /дэкан -- дацэнт Б.М.Зайцаў/.

У аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы сярод неспартыўных факультэтаў ВНУ рэспублікі філалагічны факультэт ГДУ /дэкан -- дацэнт У.Д.Еўтухоў, нам. дэкана па спартыўна-масавай рабоце В.В.Калачоў/ заняў ганаровае дзевятае месца, падняўся на пяць ступенек у параўнанні з кваліфікацыяй 1995 года.

Ва універсітэцкіх спартсменаў ёсць добрыя рэзервы і магчымасці для таго, каб дасягнутыя поспехі сёлета замацаваць і памножыць.

**У.ЛЕМЯШКОЎ,**
**старшыня спартклуба.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
**імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады -- загадчыка кафедры англійскай мовы.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Дэканат, выкладчыкі і студэнты фізічнага факультэта, прафком студэнтаў смуткуюць з выпадку раптоўнай смерці студэнта гр. Ф-32 **ПІНЧУКА Вячаслава Анатольевіча** і выказваюць глыбокае спачуванне яго бацькам і родным.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паледрук", г Гомель, вул. Савецкая, 1

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 81.
Падпісана да друку 7.03.97.